# Родаваарыентаваныя ўяўленні ў традыцыйнай культуры беларусаў і асаблівасці іх даследавання

*ч.2*



**Вольга Шарая,**
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук

**Анатацыя.** *У артыкуле з улікам даных комплексных палявых даследаванняў, праведзеных аўтарам, прадстаўлены вынікі вывучэння родаваарыентаваных уяўленняў, якія з'яўляюцца важнай часткай традыцыйнай культуры беларусаў, а іх даследаванне – самастойным навуковым напрамкам.*

**Ключавыя словы:** *родаваарыентаваныя ўяўленні, культ продкаў, патрылінейнасць, сямейная рэлігійнасць, Дзяды, ваджэнне Ку́ста, гістарычныя формы сям'і і сістэмы роднасці.*

**Для цытавання:** *Шарая В. Родаваарыентаваныя ўяўленні ў традыцыйнай культуры беларусаў і асаблівасці іх даследавання. Ч. 2. // Наука и инновации. 2023. №6. С. 66–71.*

Родаваарыентаваныя ўяўленні у традыцыйнай культуры маюць свае рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці. Толькі праз вывучэнне канкрэтнай традыцыі можна выявіць наяўнасць або адсутнасць, ступень выражанасці гэтага кампанента народнай культуры.

Каляндарны абрад ушанавання продкаў Дзяды займаў асаблівае месца ў традыцыйнай культуры беларусаў, з ім суадносіліся некаторыя іншыя рытуальныя практыкі. Так, у некаторых рэгіёнах з часам правядзення Дзядоў звязана ўпарадкаванне магіл. На Падзвінні гэта Прыкладзіны – абкладанне магілы дзёрнам, дрэвам, пастаноўка помніка і інш. Звычайна магілу прыводзілі ў парадак перад Дзядамі, якія называліся Асяніны. У лакальных традыцыях Падзвіння інфарманты адзначалі, што толькі да Асянін абкладваюць дзёрнам свежую магілу, калі хто памрэ, каб, калі прыдзе зіма, яму было цёпла (в. Слабада Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці)[1]. Згодна з эмпірычнымі данымі, у в. Калягі Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці было двое Дзядоў, якія прыходзіліся на восень,– Стаўры і Асяніны. Галоўнымі Дзядамі ў гэтай вёсцы лічыліся Асяніны.

У асобных заходнепалескіх вёсках у мінулым ставілі надмагільныя канструкцыі, якія называліся «нару́бамі». Па сведчаннях інфармантаў, у в. Парэ Пінскага раёна Брэсцкай вобласці «Нару́бы ста́вылы, дэрэвя́ные… ні́колы усі́ становы́лы». І толькі пазней сталі ўсталёўваць помнікі. Г. Цыхун адзначае, што «найбольшую праблему складае мноства назваў, якія выкарыстоўваюцца ў розных кутках Палесся для

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы, атрыманыя аўтарам у выніку палявых даследаванняў

абазначэння адных і тых жа або падобных рэалій…» [2]. Гэта тычыцца і розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

У в. Багданаўка Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці дубовыя калоды на вясковых могілках, якія захаваліся да нашага часу, носяць назву «пры́клад». Згодна з паведамленнямі інфармантаў, у мінулым казалі: «пры́клад трэ́ба робы́ты»; «пры́клад зробы́лы», гэта азначала, што «коло́да з ду́ба» і «крэста́ з хво́йі ро́блять, хто з ду́ба, хто з хво́йі»; «то́ко коло́да з ду́ба». «Пры́клад» ставілі па усім: мужчынам, жанчынам, дзецям. Але калі дзіця памрэ неахрышчаным, то не ставілі. «Пры́клад» у дадзенай лакальнай традыцыі – дубовая калода з сучком, напраўленым уверх, на якім робяць крыжык.

У в. Багданаўка адзначалася трое Дзядоў: перад Пасхай, перад Тройцай, перад Вялікім Пастом. Згодна з традыцыяй у гэтай вёсцы «пры́клад» у мінулым рыхтавалі да Дзядоў: «Вжэ Дэды́ прыхо́дять, вжэ нашыху́ють коло́ду, прыго́товлять крэста́». Але прыкладваюць менавіта на асеннія Дзяды перад Вялікім Пастом. Як адзначаюць інфарманты, у суботу «На Дэды́ вра́но вжэ на коню́ вэзу́ть обяза́тельно. На Дэды́ вэзу́ть вжэ пры́клад,…там прыло́жать». Пасля ўстаноўкі калоды, крыжа маліліся. Некаторыя прыносілі маленькую буханачку хлеба, іншыя пасыпалі магілу памерлага зернем. Пасля гэтага вярталіся дамоў, запальвалі свечку, садзіліся за стол.

Пры даследаванні ўшанавання продкаў ва ўсходніх славян перспектыўным з'яўляецца разгляд каляндарных абрадаў Дзяды і Куст. Калі першы з гэтых абрадаў быў


Калоды на магілах у Багданаўцы. Лунінецкі павет. Фота Я. Булгака. Да 1939 г.

дастаткова шырока вядомы, то другі да 90-х гадоў XX ст. заставаўся малавывучаным.

Куст («воды́ты Ку́ста», «ходы́ты у Ку́ста») – архаічны каляндарны абходны абрад, сучасны арэал якога з невялікімі адхіленнямі супадае з Піншчынай гістарычнай; абрад зафіксаваны на тэрыторыі сучасных Пінскага, Іванаўскага раёнаў, часткова – Лунінецкага, Столінскага, Івацэвіцкага; у вёсцы Спорава Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці Беларусі; паўднёвая частка арэала абраду ахоплівае поўнач Роўненскай і Валынскай абласцей Украіны (Зарэчненскі раён Роўненскай вобласці, уключае вёскі Дубровіцкага раёна Роўненскай вобласці, Любешоўскага раёна Валынскай вобласці) [4]. Арэал ку́ставага абраду суадносіцца з тэрыторыяй рассялення дрыгавічоў [3].

Абрад «ваджэння Ку́ста» выконваўся на першы або другі дзень Тройцы. Яго праўдзенню часта папярэднічалі Траецкія Дзяды.


Дубовыя калоды на могілках, якія захаваліся да нашага часу. Багданаўка, Лунінецкі раён Брэсцкай вобласці. 2014 г. Фота В. Шарай



Абрад «ваджэнне Ку́ста». Абрадавая група жанчын. У час абходу. Вёска Буса, Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці. 1996 г. Фота В. Шарай

Абрад таксама суадносіцца з днямі памінання памерлых у чацвер пасля Тройцы.

Куст – назва абраду, яго галоўнай фігуры, песенны вобраз. У найбольш архаічных формах галоўная фігура абраду – жанчына (дзяўчына), з ног да галавы прыбраная ў зеляніну: «Куст закры́ты, нэчо́го нэ выдно́», «увэ́сь у зэлёному, коб нэ выдно́ було́». Ва ўбранні з зеляніны дамінаваў клён. Маўчанне, закрытасць, непазнавальнасць – рысы галоўнай фігуры абраду, якія, згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі, атаясамліваюцца з «тым светам».



Убранне дзяўчыны-Ку́ста ў зеляніну з выкарыстаннем аеру. Вёска Асаўніца, Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці. 1996 г. Фота В. Шарай

Палявое даследаванне дазволіла выявіць, што ў межах усяго арэала абраду «ваджэння Ку́ста» для яго галоўнай фігуры – жанчыны, прыбранай у зеляніну, устойліва захоўваецца назва мужчынскага роду – Куст (Ку́ста) з націскам на першы склад [4]. Выяўлена, што для ўдзельнікаў абраду лексема «куст» – гэта не расліна. Для абазначэння расліны (куста) выкарыстоўвалася другая лексема – «корч». Такім чынам, у арэале абраду ўжыванне слова «куст» («ку́ста», заўсёды з націскам на першы склад) характарызуецца строгай ча́савай прымеркаванасцю – толькі на Тройцу, у сувязі з абрадам «ваджэння Ку́ста». Тое, што ў арэале бытавання абраду лексема «куст» выкарыстоўвалася толькі адзін раз на год, а таксама тое, што ў аўтахтоннага насельніцтва ў паўсядзённым ужыванні ў мінулым гэтая лексема адсутнічала, пацвярджае значнасць і сакральнасць галоўнай фігуры абраду, абрадавага сімвала – Ку́ста.

Абрад пачынаўся з убірання ў зеляніну жанчыны, якая выконвала ролю Ку́ста. Абрадавая група на чале з Ку́стам абыходзіла двары, выконвала ку́ставыя песні, звярталася да гаспадара дома з просьбай «надарыць Ку́ста». Пры абходзе падвор’яў жанчыны з абрадавай групы ўступалі ў дыялог з гаспадарамі. Гэта таксама адлюстравана на вербальным узроўні – у рытуальных ку́ставых песнях дамінуе зварот да гаспадара. Паміж гаспадарамі дамоў і Ку́стам устанаўліваліся асаблівыя адносіны праз акт прынясення сімвалічнай ахвяры гаспадарамі, пры гэтым жанчыны выступалі ў ролі пасрэднікаў. Дары для Ку́ста прымала адна з жанчын абрадавай групы. На працягу гэтай цырымоніі прыбраная ў зеляніну жанчына – Куст – заставалася цалкам пасіўнай і маўклівай. Для семантыкі абраду характэрны песенны матыў «гасцяванне Ку́ста ў бацькі», які, згодна з данымі праведзеных намі ў 1990-я гады палявых даследаванняў, сустракаецца на поўдні, на паўднёвым усходзе і на поўначы арэала.

Куст з’яўляўся сімвалічным прадстаўніком «таго свету», да якога належалі продкі роду, якія адыйшлі з жыцця. Такім чынам абрадавыя дзеянні з Ку́стам на гаспадарскім дворы аб’ядноўвалі дзве часткі патрылінейнага роду – адышоўшых з жыцця продкаў і іх жывых нашчадкаў. Дары, якія перадаваліся гаспадарамі для Ку́ста, былі прызначаны для продкаў роду. Цыры-

монія паўтаралася на дварах іншых гаспадароў. Па заканчэнні абраду зеляніну з жанчыны здымалі. Ён заканчваўся калектыўным застоллем.

Важна адзначыць, што ў публікацыях з сярэдзіны XIX да пачатку XXI ст., якія ўключалі эмпірычныя даныя аб абрадзе «ваджэння Ку́ста», былі зафіксаваны пэўныя архаічныя кампаненты яго першапачатковай формы. Паколькі змяняліся сацыяльныя ўмовы існавання, абрад перацярпеў значную трансфармацыю. Ён склаўся ў іншых гістарычных умовах і адпавядаў гістарычным формам сям'і і сістэмам роднасці, адрозным ад тых, што мелі месца ў беларусаў пасля XVI ст. У абрадзе «ваджэння Ку́ста» знайшлі адлюстраванне важнейшыя рысы патрылінейна-родавых адносін, вытокі якіх звязаны з такой гістарычнай формай сямейна-родавай арганізацыі, як дварышча [4], якой гэты абрад арганічна адпавядаў. Абавязковым для такога сацыяльнага ўладкавання было адзінства тэрыторыі, кроўнароднасных сувязей па мужчынскай лініі і патрыярхальнай сямейнай рэлігіі. Абрад і адпаведныя яму рэлігійныя ўяўленні былі рэгулятарам адносін паміж жывымі і памерлымі членамі роду [4].

Атрыманыя даныя дазволілі зрабіць выснову аб вызначальным значэнні ў абрадзе «ваджэння Ку́ста» ідэі культу патрылінейнага роду [4]. Ахвяраванні для продкаў павінны былі забяспечыць увесь комплекс умоў, неабходных для жыццядзейнасці роду, у тым ліку і ўмовы для росту раслін [4].

Вытокі культу продкаў звязаны з гістарычнымі формамі патрыярхальнай сацыяльнай структуры. Распаўсюджванне ў мінулым патрылінейна-комплексных сем'яў было вызначальным фактарам, які садзейнічаў узнікненню і захаванню абрадаў ушанавання продкаў у беларусаў. Смерць галавы такой сям'і, заснаванай на кроўнай роднасці па мужчынскай лініі, не прыводзіла да яе распаду і падзелу зямлі. Агульны культ продкаў быў ідэалагічнай асновай для захавання патрылінейна-комплексных сямейных форм на працяглым гістарычным этапе.

На змяненне абрадаў ушанавання продкаў вялікі ўплыў аказала прыняцце хрысціянства і змяненне гістарычных форм сям'і і сістэм роднасці. Абрадавыя практыкі і адпаведныя ім родаваарыентаваныя ўяўленні ў традыцыйнай культуры беларусаў былі звязаны з такімі гістарычнымі сямейна-родавымі структурамі, як дварышча. Дварышчы былі шырока распаўсюджаны да XVI ст. У XVI і XVII ст. сямейныя абшчыны


Дыялог абрадавай групы жанчын на чале з Ку́стам з гаспадыняй хаты. Вёска Буса, Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці. 1996 г. Фота В. Шарай


Развітанне дзяўчыны з бацькоўскім домам. Гарыздрычы, Кобрынскі павет. Фота Ю. Абрэмбскага, 1934–1937 гг.

ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне ўжо знаходзіліся ў пераходным стане. У новых сацыяльна-гістарычных умовах дамінуючай формай паселішча стала сяло.

Нягледзячы на тое, што першапачатковая сацыяльная аснова, якая спараджала культ продкаў, распалася, родавая свядомасць, заснаваная на такой ідэалогіі, яшчэ доўга праяўляла сваю жыццяздольнасць.

У традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў родаваарыентаваныя ўяўленні былі яўна выражаныя ў вясельнай абраднасці. У патрылінейна-комплексных сем'ях вяселле для нявесты азначала адыход з сям'і, роду. Адпаведна, колькасны склад жанчын такіх сем'яў папаўняўся ў выніку жаніцьбы мужчын. Такім чынам, шлюб для жанчыны быў не толькі пераходам нявесты ў іншую полаўзроставую групу, але і ў іншую сям'ю.

Праведзеныя даследаванні паказалі, што ў рэгіёнах Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы, Карэліі, Усходняй Фінляндыі наяўнасць такога элемента вясельнай абраднасці, як абрадавае развітанне нявесты з бацькоўскім домам, родам, карэлюе з абласцямі распаўсюджвання ў мінулым патрылінейна-комплексных сем'яў [6].

Ва ўсходняй і паўднёва-ўсходняй еўрапейскай прасторы вяселле для нявесты значыла растанне з мінулым жыццём, пераход у іншую сям'ю, далучэнне да чужога роду. У такой традыцыі плач нявесты быў абавязковым. Як адзначаюць інфарманты, «як забыра́ють, то пла́чэ ка́жна молода́я, бо ж выхо́дыть з до́му, да й ідэ́ в чужу́ю ха́ту» (в. Багданаўка Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці). Кожная маладая абавязкова павінна ў пэўныя моманты вяселля плакаць, гэта, як лічылася, неабходна для вымольвання сабе ў Бога шчаслівай у будучыні замужняй долі. Сіроты ўяўляюць сабой асобную катэгорыю, на якую ў два разы больш уплываў гэты закон [12].

У сіроцкай вясельнай абраднасці традыцыйныя родаваарыентаваныя ўяўленні праяўляліся найбольш яскрава. Акрамя абавязковых рытуальных дзеянняў вяселле сіраты адрознівалася сваімі характэрнымі элементамі на рытуальным і вербальным узроўні. Хаця сірот благаслаўляюць хросныя бацькі, родны дзядзька, брат, якія замяняюць бацькоў, гэта не лічыцца дастатковым, пра што сведчаць некаторыя асаблівасці вясельнага рытуалу і тэксты сіроцкіх песень. Нявеста-сірата абавязкова павінна атрымаць благаславенне бацькоў. Сіле бацькоўскага благаславення надавалася вялікае значэнне, з ім было звязана забеспячэнне дабрабыту маладой.

У пачатку першага дзесяцігоддзя XXI ст. традыцыйныя ўяўленні пра сірату сталі разглядацца з новых пазіцый – у кантэксце даследаванняў народнай рэлігійнасці, асаблівасцей родаваарыентаваных уяўленняў у міжкультурным параўнанні [4, 10].

Традыцыя, калі сірата-маладая (малады) перад вяселлем або менавіта перад вянчаннем ішлі на могілкі і запрашалі памерлага бацьку (маці) на вяселле, была шырока распаўсюджанай у беларусаў. Звароты нявесты-сіраты да бацькоў на магіле часта ўключалі элементы, якія былі характэрныя для пахавальных галашэнняў.

Галоўным матывам сіроцкіх песень беларусаў з'яўляецца пошук сіратой магілы бацькоў і зварот з просьбай благаславіць. Варыянты песні з дадзеным матывам шырока распаўсюджаныя ў розных лакальных традыцыях беларусаў. У лакальнай традыцыі Падзвіння намі зафіксавана песня з матывам «кладкі, па якой пераходзяць з “таго свету”», яе выконвалі, як адзначаюць інфарманты, калі «бацька памершы».

У сіроцкіх вясельных песнях беларусаў прадстаўлены матыў з просьбай-зваротам нявесты-сіраты да свайго бацькі (маці) прыйсці на вяселле – устаць хоць на адзін дзень, вечар, гадзіну: «Устань, устань, родная матуля, не ляжы, // Ты для мяне гэты дзянёчак пажамы» (в. Міхалішкі Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці); «Устань, устань, мая мамачка, ні ляжы, // Хоць жа ты мне адзін вічарок памажы. // Хоць на мяне ты ў вяночку паглядзі» (в. Калягі Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці); «Устань, татачка, устань, родненькі, хоць на 'дну гадзіначку. // Да я хадзіла, да я прасіла ўсю сваю радзіначку. // Адзін, татачка, не йдзеш, не едзеш мяне благаслаўляці» [1].

У вясельным абрадзе сіраты глыбока адбіліся асаблівасці народнай рэлігійнасці беларусаў, звязанай з культам продкаў, адлюстраваны традыцыйныя ўяўленні, у адпаведнасці з якімі памерлыя продкі маглі ўплываць на жыццё сваіх родзічаў. Даследаванні традыцыйных уяўленняў пра сірату ў кантэксце народнай рэлігійнасці [10] садзейнічалі істотнаму пашырэнню кола эмпірыч-

ных даных, разгляду тэмы сіраты ў шырокім кантэксце. Гэтая тэндэнцыя перспектыўная і ў далейшым. Новыя даныя, разгледжаныя ў сувязі з ужо наяўнымі, могуць садзейнічаць развіццю даследаванняў традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў. Цікавасць уяўляе таксама далейшае вывучэнне тэмы сіраты ў кантэксце звычаёвага права, у сувязі з дынамікай гістарычных сямейных структур у беларусаў.

Родаваарыентаваныя ўяўленні былі яўна выражаныя ў пахавальна-памінальнай традыцыі. Патрылінейныя родавыя групы мелі свае ўласныя месцы на могілках, такім чынам магілы размяшчаліся ў адпаведнасці з прыналежнасцю памерлага да канкрэтнай сямейна-родавай групы. Такі парадак лакалізацыі месцаў на могілках, як адзначаў М. Філіповіч,– знак таго, што ўсведамленне агульнага паходжання выходзіла за межы смерці і сапернічала з разуменнем абшчынных сувязяў [11].

Родаваарыентаваныя ўяўленні мелі свае асаблівасці ў абрадавых галашэннях, якія характэрны для пахавальнай і звязанай з ёю памінальнай абраднасці да года пасля смерці, а таксама некаторым іншым абрадам, у якіх цэнтральнай з'яўляецца тэма развітання з тымі, хто пакідаў сям'ю (род). Важны элемент традыцыйных уяўленняў – вера у сустрэчу памерлага з продкамі, якія знаходзяцца на «тым свеце», што знайшло адлюстраванне ў адпаведных галашэннях.

Даследаванне родаваарыентаваных уяўленняў паказала, што яны з'яўляюцца арганічнай часткай традыцыйнай культуры беларусаў. Гэта абумоўлена іх сувяззю з гістарычнымі структурамі сям'і і роднасці, асаблівасцямі сацыяльна-эканамічнага і культурнага характару. У мінулым, згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі, родавыя адносіны не абмяжоўваліся зямным жыццём, а распаўсюджваліся за яго межы, што было характэрна для архаічнай рэлігійнасці. Пры гэтым забяспечваліся не толькі выключна рэлігійныя запатрабаванні і імкненні, а рэгулявалася ўся сфера складаных полаўзроставых, родавых і міжродавых, эканамічных адносін, забяспечвалася жыццёвасць, устойлівае ўзнаўленне ўсталяваных сацыяльных структур і адпаведнага тыпу сацыяльных адносін.

Даследаванне родаваарыентаваных уяўленняў у традыцыйнай культуры з'яўляецца самастойным навуковым напрамкам [4, 5–9]. ■

■ **Summary.** The article, taking into account the data of complex field researches conducted by the author, presents the results of the study of kin-oriented representations, which are an important part of the traditional culture of Belarusians, and their research is an independent scientific direction.

■ **Keywords:** kin-oriented representations, ancestor worship, the patrilineage, the family religiosity, Dzyady, vadzhenne Kústa, the historical family forms and the kinship systems.

■ https://doi.org/10.29235/1818-9857-2023-05-66-71

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Вяселле. Песні ў 6-ці кн. / Склад. Л.А. Малаш; Муз. дадат. З.Я. Мажэйка. Кн. 3.– Мінск, 1983.
2. Цыхун Г.А. Полесские нарубы (лингвоэтнический аспект) / Г.А. Цыхун // Язык культуры: семантика и грамматика. К 80-летию со дня рождения академика Никиты Ильича Толстого (1923–1996) / Отв. редактор С.М. Толстая.– М., 2004. С. 466–475.
3. Шарая В.М. Арэальнае вывучэнне з'яў духоўнай культуры беларусаў / В.М. Шарая // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1995. №2. С. 78–85.
4. Шарая О.Н. Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н. Шарая.– Минск, 2002.
5. Шарая В.М. Родавая свядомасць у традыцыйнай духоўнай культуры народаў Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы / В.М. Шарая // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка: XIV Міжнародны з'езд славістаў (Охрыд, 2008): Дакл. бел. дэлегацыі / НАН Беларусі; Беларускі камітэт славістаў.– Мінск, 2008. С. 321–334.
6. Шарая В.М. Сацыякультурныя асаблівасці родавых уяўленняў славян у кантэксце традыцыйнай духоўнай культуры еўрапейскіх народаў / В.М. Шарая // Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка: XV Міжнар. з'езд славістаў (Мінск, 20–27 жн. 2013): дакл. беларус. дэлегацыі / Нац. акад. навук Беларуси [і інш.]; рэдкал.: А.А. Лукашанец (адк. рэд.) [і інш.].– Мінск, 2013. С. 333–344.
7. Charaïa Olga. Représentations archaïques concernant la lignée dans les lamentations rituelles / Olga Charaïa // Cahiers slaves. №13.– Paris, 2013. P. 43–63.
8. Шарая В.М. Родаваарыентаваныя ўяўленні ў традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў / В.М. Шарая // Нарысы гісторыі культуры Беларусі // У 4 т. Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. Духоўная культура / А.І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А.І. Лакотка.– Мінск, 2016. Кн. 2. С. 458–481.
9. Шарая Вольга. Каляндарныя абрады ўшанавання продкаў у традыцыйнай культуры беларусаў: праблемы і перспектывы даследавання / Вольга Шарая // Acta Albaruthenica.– Warszawa, 2018. Tom 18. С. 317–332.
10. Шарая Ольга. Традиционные представления о сироте в обрядах жизненного цикла славянских и неславянских народов: доклад на XVI Международном съезде славистов (Белград, 20–27 августа 2018 г.) / Ольга Шарая; Национальная академия наук Беларуси; Белорусский комитет славистов.– Минск, 2018.
11. Filipović M. Methoden der Urbarmachung in Jugoslawien / M. Filipović // Getreidebau in Ost- und Mitteleuropa. Edited by Ivan Balassa.– Budapest, 1972. S. 179–204.
12. Rypiński Alexander. Białoruś: kilka słów o poezyi prostego ludu tej naszej pol. prowincji, o jego muzyce, spiewie, tancach et cetera / Alexander Rypiński.– Paryż, 1840.